Анатоль КОЗІЧ

## Занясі сняжком

Напэўна, узрастуць на дарогах сумёты.
Злятаюцца птушкі бліжэй да жытла.
Зіма прынясе за сабою турботы.
А сэрцам і хочацца, каб замяла.

Каб выла завея ад ночы да ранку,
Каб белым навокал, нібыта ў сне.
Зіму адчуваць ужо новым світанкам,
Узрадавацца шчыра ўсё той жа зіме.

Навокал – каб бы чарадзейнаю казкай,
Каб кожны куст зіхацеў бы палац.
Зіма, замяці наваколле, будзь ласка!
Заўзята ўслых данясу гэты сказ.

А толькі пакуль што ня бачна завеі,
І хлусіць, відаць, усё адно, каляндар.
Зіма, на цябе не губляю надзеі,
Сняжком занясі, не зварочвай свой твар.